Государственное учреждение образования
«Средняя школа №202 г.Минска»

220125, г. Минск, ул. Гинтовта, 22
(017) 357-55-21

# Яскравы мір маіх пачуццяў

**Автор**:
Гамидова Алеся Наримановна,

г. Минск

## Яскравы мір маіх пачуццяў

Яскравы мір маіх пачуццяў…
Той свет цікавы і дзівосны!
У ім я чую, як ялінкі
Увесну шэпчуць нешта соснам.
Я бачу, як смяецца сонца,
Раскінуўшы свае прамені,
І як гуляюць у небе хмаркі,
Як дрэвы скідваюць адзенне.
Люблю, калі матулі рукі
Пяшчотна, шчыра абдымаюць.
Калі ў твар дзьме цёплы вецер
І калі птушачкі спяваюць.
Хвілінка – і я ў снежным царстве,
А там шматкамі снег лажыцца.
Здаецца мне, што гэта песня,
І быццам усё ў ва мне іскрыцца.

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа № 13 г. Мінска”

Рэспубліканскі інтэрнэт-конкурс літаратурных работ
“АЗБУКа пачуццяў”

Аўтар: Казючыц Надзея Сяргееўна
ДУА “Сярэдняя школа № 13 г. Мінска”
вучаніца 6 “Б” класа

Мінск, 2021

**Родны мой край**

Родны мой край –
Неабсяжнасць прастораў,
Прыгожых рэк і азёраў блакіт,
Празрыстыя росы ранкам бадзёрым
І вечароў аксаміт...

Родны мой край –
Лясы Белавежжа.
Безліч у іх  птушак, звяроў.
Многія ў свеце марыць, напэўна,
Убачыць там велічных, дужых зуброў.

Родны мой край –
Памяць пра подзвіг
У час Вялікай Айчыннай вайны.
Славы Курган, абеліск Перамогі
Напамінаць нам будуць заўжды.

Родны мой край – заводы-гіганты.
Праца кіпіць ад зары да зары –
Шмат краін свету
Знаюць БелАЗы
І беларускія трактары.

Родны мой край, каштоўнасць якога –
Мірны, сціплы і шчыры народ.
Я ганаруся – і гэта цудоўна!
Звацца маленькай часцінкай яго.

ГУО «Гимназия №174 г. Минска»

Рэспубліканскі интэрнет-конкурс літаратурных работ
«АЗБУКа пачуццяў»
у рамках праекта «Script.Art.by»

# «Яскравы мір маіх пачуццяў»

Коршун Виолетта Сергеевна
5 «Д» класс,

Минск, 2021

## Яскравы мір маіх пачуццяў

Снег. Што я адчуваю, калі гляджу на снегапад? Нічога.

Хаця ... Не, не варта рабіць высоновы на падставе першых сваіх пачуццяў, нават калі табе здаецца, што ты маеш уладу над сабою. Трэба прыглядзецца. Бачыш тую белую сняжынку, якая павольна, не спяшаючыся, кружыцца ў сваім апошнім вальсе? Дзеля гэтага ёй давялося пакінуць неба, каб адчуць гэта імгненнае пачуццё свабоды і палёту. Яна ляціць гэта не спяшаючыся, грандыёзна, як быццам і не падазрае, што больш ніколі не зможа вярнуцца назад...

Спакой. Так, мне зараз вельмі спакойна, што я не адрываю свой погляд ад акна ўжо некалькі хвілін.

Але чаму мне спачатку здалося, што ўнутры мяне адчуванне пустэчы, быццам я той паветраны шарык, які такі яркі звонку, але такі пусты ўнутры, набіты толькі адным паветрам?...

Неяк у дзяцінстве мая бабуля распавяла мне казку. На свеце жыў адзін злы чараўнік. Але, акрамя злосці, ён валодаў вялікай прагнасцю. Толькі прагнасць ён выпрабоўваў не на грошах, золаце і брыльянтах. Не. Гэта ён мог стварыць сваёй магіяй ў любы момант. Ён хацеў авалодаць самым дарагім і каштоўным, чаго ў яго ніколі не было. Чалавечымі пачуццямі. Ён бачыў, што людзі здольныя здзяйсняць неверагодныя рэчы дзеля такога пачуцця, як каханне. Шчасце дарыла ім крылы, ператвараючы іх у выдатных анёлаў. Вера і надзея рабілі іх непераможнымі. Радасць надзяляла чалавечыя твары неверагоднай прыгажосцю, а сяброўства і адданасць, як верныя абаронцы, суправаджалі чалавека ў любой цяжкай сітуацыі, працягваючы сваю далонь дапамогі. Усе гэтыя пачуцці рабілі людзей самымі магутнымі на зямлі. Вось чараўнік і захацеў забраць гэта ў іх. Толькі ведаў ён, што атрымаць ён зможа іх толькі тады, калі чалавек сам адмовіцца ад сваіх пачуццяў.

І вось на кожны дзень нараджэння да чалавека прыходзіць гэты самы чараўнік і прапануе яму здзелку. І часцей за ўсё людзі наіўна пагаджаліся на тое, што ім прапаноўваў чараўнік. Яны атрымлівалі добрую працу, грошы, славу, аддаючы свае мары і пачуцці. Людзі нават і не заўважалі, што ўсё радзей і радзей пачыналі радавацца самым малым і выдатным дробязям ў іх жыцці, а ўсмешка на іх твары становілася даўно забытым госцем. А калі і заўважалі, то ўсё зводзілі да таго, што ім проста зноў не хапае грошай, а дом недастаткова вялікі і прасторны.

Думаеш, што гэта проста казка? ...

Тады задай сабе пытанне, калі ты ў апошні раз быў па-сапраўднаму шчаслівы? Шчаслівы так, што забываў пра ўсё на свеце, твой радасны смех напаўняў цябе энергіяй, а ў вачах свяціліся слёзы той самай радасці і шчасця?

Не можаш успомніць, так? Можа тады табе варта задумацца пра існаванне гэтага чараўніка.

ДЗЯРЖАЎНАЯ ЎСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«СЯРЭДНЯЯ ШКОЛА № 160 Г. МІНСКА»
220117, Г. МІНСК,  ВУЛ. РАФІЕВА, 19,
Т. 80172771362

Рэспубліканскі інтэрнэт-конкурс літаратурных работ
“АЗБУКА пачуццяў” у рамках праекту “Scrip.Art.by”

# Я ТАК АДЧУВАЮ МІР

Аўтар: Герасіменка Алёна Вадзімаўна,
8 «А» клас

Для мяне мір – гэта нешта вялікае, бо тут жыве вельмі шмат людзей, і ўсе розныя. У нас розныя інтарэсы, каштоўнасці, мэты, знешнасць, характары, і нават мова, на якой мы гаворым. Гэта так незвычайна і выдатна. Мір – гэта пазл, які кожны чалавек дапаўняе сабой. Кожны з нас – кавалачак пазла. У кагосьці гэты кавалачак чорны, як яго душа, паводзіны і ўчынкі, у кагосьці гэты кавалачак нагадвае цёплыя колеры, якія азначаюць, што гэта добры, пачуццёвы, шчыры і харызматычны чалавек.

Наш мір такі яркі, маляўнічы і незвычайны! А людзі якія – усмешлівыя, гатовыя прыйсці на дапамогу. Вядома, немагчыма судзіць усіх людзей аднолькава: кожны думае і паступае па-свойму ў той ці іншай сітуацыі. Але ж дрэнны і добры чалавек дапаўняюць адзін аднаго. Не можа быць так, каб усе былі аднолькавымі, ды і не трэба, бо тады жыццё было б сумным і аднастайным. Мы розныя, у кожнага сваё жыццё, прынцыпы, учынкі, выхаванне. Разам мы і складаем адзін вялікі пазл пад выдатнай назвай "МІР". Часам нават не верыцца, што існуе вялікая колькасць моў, шмат краін, рэлігій і народаў.

Які ж каларытны і цудоўны ў нас мір! Любіце нашу планету, бо яна непаўторная, у ёй столькі прыгожага! Напрыклад, неверагодныя маляўнічыя пейзажы прыроды, якія стварыў сам Бог: горы, моры, акіяны, пляжы, лясы, сады – любы знойдзе ў прыродзе нешта, што будзе натхняць яго. Гэта ж выдатна! Акрамя прыроды, у свеце столькі дзівоснага, створанага чалавекам: яркія дамы, што ўздымаюць настрой жыхарам, прыгожыя пабудовы рэспубліканскага значэння, якія маюць сваю каштоўнасць і гісторыю для краіны. Ва ўсім, што зроблена рукамі чалавека, кожны з нас можа знайсці тое, што будзе яму па душы.

Таксама, апрача прыроды, чалавек можа знайсці натхненне ў іншым чалавеку. Зрэшты, ва ўсім і ўсюды яго можна знайсці, гэта залежыць ад самога чалавека. Хіба гэта не цудоўна?! Я так рада, што жыву ў гэтым міры, бо ён цудоўны!

Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Сярэдняя школа № 63 г. Мінска імя М.Ф. Малаковіч”

**Для мяне галоўнае пачуццё – гэта спачуванне**

Выканала:
вучаніца 6 “Б”класа
Лазуровіч Вераніка Андрэеўна,

Мінск, 2021

У мяне, як і ў кожнага чалавека, ёсць душа, унутраны свет. Гэта мае мары, вера, думкі, успаміны, эмоцыі, а таксама пачуцці. Увогуле, усім людзям уласціва верыць, перажываць, выражаць свае эмоцыі і, вядома, адчуваць. Я лічу, што мы ўсе ў пэўнай ступені жывем у свеце разнастайных эмоцый і пачуццяў.

Адным з найважнейшых чалавечых пачуццяў, на мой погляд, з`яўляецца спачуванне. Шчыра перажываць за кагосьці, жалець, спрабаваць падзяліц і тым самым аблегчыць чужы боль – гэта тое, што адрознівае людзей ад звяроў, тое, што закладзена ў нас самой прыродай, Богам…

Спачуванне – гэта ўменне чалавека паставіць сябе на месца іншага, здольнасць зразумець яго перажыванні і боль, што выклікае жаданне дапамагчы яму перанесці цяжкасці і пакуты. Я ўпэўнена, што спачуванне – адно з самых высакародных пачуццяў, але яно дадзена не кожнаму: толькі вельмі спагадлівыя, добразычлівыя і міласэрныя людзі здольны праяўляць сапраўднае спачуванне. Пры гэтым унутры ўзнікае вострае адчуванне жалю ў адносінах да другога чалавека, разуменне яго болю.

Калі чалавек спачувае камусьці, ён раздзяляе яго лёс, пакутуе разам з ім і ўсім сэрцам імкнецца дапамагчы. Менавіта так праяўляецца сапраўднае спачуванне. Бо вельмі часта ў нашым жыцці сустракаецца зусім не шчырае пацуццё. Бывае, што людзі знешне быццам бы спачуваюць, але робяць гэта крывадушна, не сапраўды, а з мэтай атрымаць пэўную асабістую выгаду ці проста паглядзець на чужую бяду, разважаючы так пры гэтым: «Як добра, што гэта здарылася не са мною і не з маімі блізкімі! Як хораша, што дрэнна не мне і не тым, каго я люблю!» Такое «спачуванне» даволі распаўсюджана ў наш час, але яно не нясе ў сабе нічога карыснага. Сапраўднае спачуванне павінна праяўляцца ў справах. Я лічу, што кожны чалавек павінен уважліва, вельмі акуратна адносіцца да людзей вакол, не думаючы толькі пра сябе любімага. І калі хтосьці побач апынуўся ў складанай сітуацыі, у бядзе, трэба ўсім сэрцам, усімі сіламі старацца дапамагчы. Неабходна вельмі ўважліва паслухаць чалавека, каб правільна «разглядзець» праблему, паставіць сябе на яго месца і тым самым зразумець, якая дапамога яму ў дадзены момант патрэбна. Бывае, што дастаткова падтрымаць проста добрым словам, каб чалавек зноў паверыў у сябе і расправіў перабітыя крылы. А бывае і так, што патрэбны і больш актыўныя дзеянні.

Некалькі гадоў таму я са сваімі сёстрамі гуляла на пляцоўцы каля дома. Была вельмі ўнылая пара года – канец лістапада. Каторы дзень церусіў бясконцы дождж, золкі вецер абарваў апошнюю лістоту з дрэў. Было холадна і вельмі сумна, мы не ведалі, чым заняцца. І раптам з кола прыпаркаванай каля пляцоўцы машыны саскочыў драмаўшы там маленькі кацяня. Ён, няспынна мяўкаючы і калоцячыся ад холаду, стаў піць ваду з лужыны каля нас. Нам стала нясцерпна жаль яго. І не толькі нам: суседская дзяўчына скінула з акна вялікі кавалак сасіскі. Галоднае кацяня літаральна праглынула сасіску разам з абгорткай. Мы зразумелі, што небараку трэба спасаць. Схапілі

яго і пабеглі дамоў угаворваць бацькоў пакінуць малога ў сябе. Так у нашай вялікай сям`і з`явіўся новы член – кацянё Маруська.

Я лічу, што міласэрнасць, любоў і спачуванне павінны быць у душы кожнага чалавека. Мы ўсе павінны станавіцца больш уважлівымі да чужой бяды, праяўляць міласэрнасць і прапанаваць сваю дапамогу. Бо кожны з нас калі-небудзь можа апынуцца ў складанай жыццёвай сітуацыі, калі працягнутая рука дапамогі нам будзе проста неабходна. Я ўпэўнена, што спачуванне, як і любоў да бліжняга, – выдатная якасць, якая сёння мае вялікую каштоўнасць.

Дзяржаўная ўстанова адукацыі

“Сярэдняя школа № 202 г. Мінска”

Рэспубліканскі інтэрнет-конкурс літаратурных работ

“АЗБУКа пачуццяў”

Юрчык Дар’я Віктараўна

7 «В» клас

**Пачуцці**

Пачуццяў шмат на свеце ёсць:
нянавісць, гнеў і весялосць,
каханне,радасць, страх, любоў...
Пачуццяў больш за сотню слоў.

З аднымі я сустрэцца рада:
давер, упэўненасць, спагада.
З другімі не хачу сустрэч:
адчай, агіда, злосць − усе прэч.

Хачу бяспекі, асалоды,
пяшчоты, гонару, свабоды,
задавальнення, захаплення,
спакою для свайго сумлення.

Хачу жыццём замілавання.
Хачу шчаслівых прадчуванняў.
Яшчэ ёсць шмат, чаго хачу,
але аб гэтым памаўчу.